12. Grafenauer, B. Slovenska Koroška v diplomatski igri leta 1919: vprašanje jugoslovansko-avstrijske meje na pariški mirovni konferenci / B. Grafenauer // Koroški plebiscite. – Ljublijana : Slovenska matica, 1970. – S. 295–378.
13. Himmelreich, B. Slovenci in pariška mirovna konferenca 1919–1920 / B. Himmelreich // Celjski zbjrnik. – № 30, št. 1 (1994). – S. 135–158.
14. Kardum, L. Diplomatska borba za Korušku na Pariškoj mirovnoj konferenciji 1919. Godine / L. Kardum // Politička misao: Croatian Political Science Rewiev. – Vol. XXXVIII (2001). Br. 1. – S. 125–142.
15. Lipušček, U. Ave Wilson: ZDA in prekrajanje Slovenije v Versaillesu 1919–1920 / U. Lipušček. – Ljubljana : Sophia, 2003. – 395 s.
16. Perovšek, J. Slovenska osamosvojitev v letu 1918: študija o slovenski državnosti v Državi Slovencev, Hrvatov in Srbov / J. Perovšek. – Ljubljana : Modrijan, 1998. – 192 s.
17. Perovšek, J. «V zaželjeni deželi»: slovenska izkušnja s Kraljevino SHS/Jugoslavijo: 1918–1941 / J. Perovšek. – Ljubljana : Inštitut za novejšo zgodovino, 2009. – 314 s.
18. Rahten, A. Dr. Ivan Schwegel in jadransko vprašanje na pariški mirovni konferenci / A. Rahten // Acta histriae / Zgodovinsko družtvo za južno Primorsko – Koper. 2010. – № 3 (18). – S. 691–712.
19. Reissner, W. The Black Book: Woodrow Wilson's Secret Plan for Peace / W. Reissner. – Lanham, Md. : Lexington Books, 2012. – 214 p.
20. Sejni zapisniki Narodne vlade Slovencev, Hrvatov in Srbov v Ljubljani in Deželnih vlad za Slovenijo: del 1–3. – Ljubljana : Arhiv Republike Slovenije, 1998–2002. – Del 1 : Od 1. nov. 1918 do 26. feb. 1919. 1998. – 415 s.
21. Sienčnik Luka. Koroški plebiscit 1920. – Maribor : Obzorja, 1987. – 426 s.
22. Švajncer, J. Slovenska vojska 1918–1919 / J. Švajncer. – Ljubljana : Prešernova družba, 1990. –332 s.
23. Ude, L. Boj za severno Slovensko mejo 1918–1919 / L. Ude. – Maribor : Založba obzorja, 1977. – 294 s.
24. Zapisnici sa sednica delegacije Kraljevine SHS na Mirovnoj Konferenciji u Parizu 1919–1920. – Beograd : Kultura, 1960. – 431 s.

## БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІЯ АДНОСІНЫ ЧАСОЎ ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ 1919–1920 гг.: АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

М.М. Мязга (Гомель)

Працэс станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці хранагалічна супаў з падзеямі польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. Гэтыя падзеі былі ўзаемазвязаныя. Яны выклікаюць вострыя дыскусіі ў беларускай і польскай гістарыяграфіях, маюць патрэбу ў больш грунтоўным, дэталёвым вывучэнні і новых інтэрпрэтацыях.

Пачатак польска-савецкай вайны быў выкліканы ў першую чаргу спрэчкай паміж Польшчай і Расіяй за тэрыторыі, якія ляжалі паміж іх этнічнымі граніцамі. Пры гэтым абодва бакі зыходзілі з наяўнасці ў іх «гістарычных праў» на гэтыя землі. Савецкая Расія дэкрэтам ад 29 жніўня 1918 г. скасавала ўсе дагаворы, якія былі заключаны царскай Расіяй адносна падзелаў Рэчы Паспалітай, што цягнула за сабою юрыдычную адмову ад тэрыторый, якія ўваходзілі ў яе да раздзелаў. Патрабуе ўдакладнення пытанне: ануляваўшы Брэсцкі мір, ці адмовілася тым самым Савецкая Расія і ад палажэнняў, выкладзеных у дэкрэце ад 29 жніўня 1918 г., і тым самым заявіла аб праве ўстанавіць кантроль над землямі, які адышлі

да Расіі па падзелах Рэчы Паспалітай. Расійскі бальшавіцкі ўрад прэтэндаваў на ўладу на магчыма большай тэрыторыі былой Расійскай імперыі, уключаючы Беларусь. У сілу названых абставін ён разглядаў прасоўванне Чырвонай Арміі на тэрыторую Беларусі як элемент унутраннай расійскай грамадзянскай вайны. Польскі ж урад зыходзіў з таго, што расійскія войскі ўступілі на тэрыторыю, якая не належыць Расіі. На наш погляд, беларуская гістарыяграфія павінна даць сваю ацэнку факту ўступлення Чырвонай Арміі і Войска Польскага на беларускія тэрыторыі з пункту гледжання ўплыву на пачаўшыеся тут дзяржаватворчыя працэсы. На сённяшні дзень сярод гісторыкаў выклікае дыскусіі пытанне ці было наступленне Чырвонай Арміі на захад у канцы 1918 – пачатку 1919 г. спробай падштурхнуць сусветную рэвалюцыю і якая роля пры гэтым адводзілася Беларусі.

Як вядома, у польскай палітычнай эліце на момант аднаўлення незалежнасці Польшчы ў 1918 г. існавалі дзве канцэпцыі адносна палітычнай пабудовы тэрыторый, якія ляжалі паміж этнічнымі польскімі і этнічнымі рускімі землямі: федэрацыі і інкарпарацыі. На наш погляд, на сённяшні дзень актуальным для даследавання застаецца пытанне аб тым, у якой ступені планы прыхільнікаў гэтых дзвюх канцэпцый разыходзіліся ў дачыненні да беларускіх зямель. Тыя палітычныя колы, якія стаялі на пазіцыі інкарпарацыі, выступалі за падзел беларускіх зямель з Расіяй па «лініі Дмоўскага». Прыхільнікі федэралізму мелі на ўвазе стварэнне Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Але, як адзначаў блізкі паплечнік Ю. Пілсудскага Л. Васілеўскі, «у адносінах усходняй граніцы Пілсудскі ў цэлым пагаджаўся з лініяй, прапанаванай Дмоўскім» [9, s. 172]. У снежні 1919 г. сакратар Ю. Пілсудскага Світальскі запісаў наступнае яго выказванне: «Анексіяністцкую і федэралісцкую канцэпцыі не трэба супрацьпастаўляць адну другой, адна не выключае другую; трэба толькі паставіць федэралісцкую канцэпцыю на першы план, каб у выпадку, калі яе не ўдасцца ажыццявіць, застаўся другі выхад [6, с. 262]. Мяркуем, да пачатку 1920 г. можна казаць пра канчатковы адыход Ю. Пілсудскага ад палітыкі, накіраванай на стварэнне Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Пры гэтым прадстаўляецца актуальным пытанне ў якой ступені на пачатковым этапе польска-савецкай вайны ён імкнуўся да стварэння названай дзяржавы, ці гэта быў толькі тактычны ход, каб прадставіць Польшчу перад Антантай як краіну, якая паважае права народаў на самавызначэнне.

У час польска-савецкай вайны беларускі нацыянальны рух спрабаваў знайсці падтрымку як у Варшаве, так і ў Маскве. На сённяшні дзень у беларускай гістарыяграфіі акцэнт робіцца на нежаданне польскіх улад аказаць рэальную падтрымку беларускаму адраджэнню [7, с. 17–18]. Пры гэтым некалькі ў баку застецца пытанне аб матывах і аб эвалюцыі польскай палітыкі па гэтаму пытанню. Неабходна звярнуць увагу на яе залежнасць ад таго, якой была сітуацыя на фронце і сувязь з імкненнем не даць супрацьлегламу боку выкарыстаць беларускі рух у сваіх інтарэсах. Стаўшыя даступныя гісторыкам матэрыялы пасяджэнняў палітбюро ЦК РКП(б) дазваляюць больш грунтоўна ахарактарызаваць пазіцыі і матывы

прадстаўнікоў савецкага кіраўніцтва па пытанню супрацоўніцтва з урадам В. Ластоўскага.

Сучасная беларуская гістарыяграфія звязвае першае абвяшчэнне ССРБ з наспяваннем і пачаткам польска-савецкай вайны [5]. У гэтым кантэксце патрабуе грунтоўнага вывучэння пытанне аб імкненні савецкага кіраўніцтва прадставіць Савецкую Беларусь, а затым ЛітБел ССР у якасці партнёра Польшчы для перагавораў з мэтай мірнага ўрэгулявання наспяваючага канфлікту. 10 лютага 1919 г. Г. Чычэрын накіраваў ноту польскаму ўраду, у якой прапанаваў палякам для ўрэгулявання тэрытарыяльнага пытання звяртацца да савецкіх рэспублік Літвы і Беларусі, «якіх яно датычыцца непасрэдна» [1, с. 40]. Аднак 4 красавіка сейм Польшчы адмовіўся прызнаць незалежнасць Літоўска-Беларускай ССР. Адмову Польшчы весці перамовы з савецкім урадам Літвы і Беларусі нельга зводзіць да яго нежадання прызнаваць гэты ўрад, бо, як заявіў у сейме С. Грабскі, «гэта не самастойны ўрад, а абавязаны сваім існаваннем расійскім бальшавікам» [2, с. 252, 289]. Тэрытарыяльныя памкненні Польшчы ва ўсходнім напрамку таксама неабходна браць у разлік. У выніку мірнае ўрэгуляванне тэрытарыяльнай спрэчкі аказалася немагчымым, а вайна паміж Польшчай і Савецкай Расіяй за валоданне тэрыторыямі былых «усходніх крэсаў», у тым ліку беларускімі, стала непазбежнай.

У вядомай віленскай адозве Ю. Пілсудскі гаварыў аб праве народаў былога ВКЛ самім вызначаць свой лёс. Але ажыццяўленне планаў як прыхільнікаў федэрацыі, так і інкарпарацыі вяло да таго, што тэрыторыі для стварэння Беларускай дзяржавы практычна не заставалася. Тым не менш польскія правячыя колы ажыццяўлялі кантакты з беларускімі дзеячамі. Неабходна звярнууцца да пытання аб сувязі паміж гэтымі кантактамі і міжнародна-палітычным становішчам Польшчы ў канкрэтны момант. У інструкцыі МЗС ад 7 ліпеня 1919 г. рэкамендавалася пытанне далучэння зямель на ўсходзе да Польшчы вырашаць са згоды мясцовага насельніцтва, «а гэтая згода прадстаўляецца несумненнай. Пры гэтым неабходна пастарацца, каб гэтая згода была даказана Антанце» [2, с. 330].

У кантэксце дэманстрацыі перад Антантай гатоўнасці Польшчы паважаць правы народаў на самавызначэнне, і пошуку падтрымкі з боку беларускіх нацыянальных колаў ідэі федэрацыі трэба разглядаць і выступленне Ю. Пілсудскага ў Мінску 19 верасня 1919 г., у якім ён выказаў тэзіс аб праве беларусаў на самавызначэнне [8, s. 185]. У той жа дзень адбылася сустрэча Ю. Пілсудскага з дэлегацыяй Рады БНР. Ён заявіў, што Польшча не можа прызнаць БНР, покуль яе не прызнала Антанта [2, с. 349–350]. У лісце Ю. Асмалоўскаму ад 21 лістапада начальнік дзяржавы пісаў, што ён параіў, каб Рада БНР устрымалася ад шырокай палітычнай дзейнасці, міжнародная сітуацыя гэтаму не спрыяе. Ён выказаўся за стварэнне «беларускага П’емонта» да моманту, калі складзецца лепшая кан’юнктура. Пілсудскі прапанаваў зняць пастулат аб незалежнасці БНР і сканцэнтравацца на развіцці школьніцтва, самакіравання, прычым, толькі ў раёне Мінску [8, s. 185–186].

Неабходна ўдакладніць, у якой ступені вясной – летам 1919 г. можна весці гаворку пра імкненне польскіх правячых колаў стварыць Беларускую дзяржаву. На наш погляд, калі і існавалі такія планы, то яны датычыліся абмежаванай тэрыторыя, якая ўключала Мінск і землі на ўсход ад яго. Астатняя беларуская тэрыторыя павінна была непасрэдна ўвайсці ў склад Польшчы. Гэта быў кампрамісны варыянт, да якога схіляліся прыхільнікі і інкарпарацыі, і федэрацыі. Пры гэтым гатоўнасць Пілсудскага падтрымаць стварэнне беларускай дзяржавы нават на абмежаванай тэрыторыі выклікае сумненні, бо ён гаварыў пра падтрымку толькі культурна-асветніцкай дзейнасці беларусаў.

Для беларускай гістарыяграфіі важна высветліць, якім было стаўленне Польшчы да беларускай дзяржаўнасці ў кантэксце ваенна-палітычных падзей 1920 г. Ва ўмовах няўдач на фронце летам 1920 г. польскія палітыкі зрабілі шэраг заяў, у якіх гаворка ішла аб падтрымцы імкнення беларусаў да стварэння ўласнай дзяржавы. У чэрвені Ю. Пілсудскі і прэм'ер-міністр Польшчы Л. Скульскі выказаліся на карысць стварэння незалежнай Беларусі. Намеснік міністра замежных спраў Дашыньскі 1 жніўня ў якасці ўмоў, на якіх Польшча гатова была пайсці на перамір'е з Савецкай Расіяй, назваў, у прыватнасці, «права на самавызначэнне для народнасцей, якія знаходзяцца паміж Польшчай і Расіяй» [3, с. 116]. Узнікае пытанне, у якой ступені гэтыя заявы адлюстроўвалі рэальнае імкненне правячых колаў Польшчы садзейнічаць дасягненню незалежнасці Беларуссю, ці толькі былі вынікам жадання атрымаць падтрымку беларускага руху ў складаннай ваенна-палітычнай сітуацыі.

Грунтоўнага аналізу з пазіцый беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі патрабуе пытанне аб пазіцыі Польшчы адносна суверэнітэту Беларусі ў час мірных перамоў у Рызе з улікам таго, што гэтая пазіцыя мянялася ў неспрыяльным для Беларусі кірунку. У інструкцыі да вядзення перамоў з Савецкай Расіяй, якую польская дэлегацыя атрымала ад Савета Абароны Дзяржавы (САД) 11 жніўня, гаворка ішла аб прызнанні незалежнасці Беларусі, але без вядзення перамоў аб вызначэнні яе граніц [4, с. 286]. Аднак ужо першыя пасяджэнні мірнай канферэнцыі паказалі, што Польшча адмаўляецца ад палітыкі федэралізму і пераходзіць да рэалізацыі канцэпцыі інкарпарацыі. Кіраўнік польскай дэлегацыі Я. Домбскі заявіў на пасяджэнні САД 11 верасня, што на мінскім этапе перамоў палякі згаджаліся на існаванне савецкай формы дзяржаўнасці на Украіне і не ставілі пытанне аб незалежнасці Беларусі [4, с. 387–388].

У сучаснай гістарыяграфіі замацавалася палажэнне, згодна якому частка польскай дэлегацыі на перамовах у Рызе не адмовілася ад федэралісцкай канцэпцыі. Гэта давала шанс на стварэнне беларускай дзяржавы. Але ўзнікае пытанне аб тым, наколькі значныя былі шансы на рэалізацыю гэтых планаў, асабліва, калі ўлічыць, з якой вялікай гатоўнасцю Савецкая Расія ішла на тэрытарыяльныя саступкі Польшчы. Яшчэ адзін важны аспект перамоў у Рызе – пытанне аб удзеле ў іх беларускіх прадстаўнікоў. Падаецца, што патрабуе грунтоўнага разгляду пытанне аб тым, чаму польская пазіцыя

адносна ўдзелу ў пермовах дэлегацыі УССР і БССР прынцыпова адрознівалася, і чаму Польшча заняла салідарна з Савецкай Расіяй негатыўную пазіцыю адносна ўдзелу ў перамовах прадстаўнікоў БНР.

Як бачым, шэраг праблем беларуска-польскіх адносін часоў польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. на сённяшні дзень патрабуюць далейшага даследавання як праз прыцягненне новых гістарычных крыніц, так з дапамогай новых інтэрпрэтацый ужо вядомых фактаў. Прычым важна вывучэнне беларускімі гісторыкамі польскіх крыніц. Гэта дасць магчымасць з розных пазіцый паглядзець на працэсы і з'явы гісторыі польска-беларускіх адносін часоў польска-савецкай вайны і даць ім больш аб'ектыўнае тлумачэнне.

*Крыніцы і літаратура:*


1. «Красная книга». Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях 1918–1920 г. – М.: Государственное издательство, 1920. – 112 с.
2. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1918–1920 гг.). Зборнік дакументаў і матэрыялаў: у 4 т. – Мінск: Юніпак, 2008. – Т. 1, ч. 1. – 539 с.
3. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фармаванняў (1918–1922) / К. Гамулка. – Вільня: Выд-ва Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, 2008. – 256 с.
4. Документы и материалы по истории советско-польских отношений: в 14 т. – М. : Наука, 1965. – Т. 3. – 609 с.
5. Лазько, Р.Р. Беларуская буферная рэспубліка ў палітыцы савецкай Расіі ў пачатку 1919 года / Р.Р. Лазько // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2006. – № 2. – С. 3–10.
6. Матвеев, Г.М. Пилсудкий / Г.Ф. Матвеев. – М.: Молодая гвардия, 2008 – 474 с.
7. Снапкоўскі, У.Е. Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918–2017 гг. / У.Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2017. – 287 с.
8. Czubiński, A. Walka Józefa Piłsudskiego o nowy kształt polityczny Europy Srodkowo-Wschodniej w latach 1918–1921 / A. Czubiński – Toruń : Wydawnictwo Adam Marczałek, 2002. – 444 s.
9. Wasilewski, L. Józef Piłsudski. Jakim Go znalem / L. Wasilewski. – Warszawa : Wyd. «Rój», 1935. – 235 s.


## СРЕДНЯЯ ЛИТВА И ПОПЫТКИ РЕШЕНИЯ ВИЛЕНСКОГО ВОПРОСА В 1920 г.


С.В. Боголейша (Минск)


В октябре 1920 г. польские войска под командованием генерала Люциана Желиговского заняли Вильно, соседние территории и создали на тех землях марионеточное государство – Средняя Литва (Litwa Srodkowa), существовавшая в 1920–1922 гг. Столицей ее был объявлен Вильно. Польша и Литва вели борьбу за владение Вильно в течение нескольких лет, используя для этого различные возможности.

Польские правящие круги во главе с Ю. Пилсудским издавна рассматривали территории Гродненщины и Виленщины как "бесспорно польские". Они были одержимы идеями возрождения Польши в пределах 1772 г. и присоединения этих земель к Польше, не учитывая интересы других этносов. Ю. Пилсудский пытался создать не федерацию, которая ранее существовала в Речи Посполитой, а унитарное польское государство с ограниченной